# ВОДЗЫЎ

афіцыйнага апанента на дысертацыю **Сямашка Надзеі Канстанцінаўны** "Беларускія і расійскія даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)", прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання

**Змест і структура дысертацыі** Сямашка Надзеі Канстанцінаўны "Беларускія і расійскія даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)", прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання адпавядаюць заяўленай галіне гістарычнай навукі і спецыяльнасці

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** У айчыннай і расійскай гістарыяграфіі існуе значны пласт навуковых, навукова-папулярных і публіцыстычных прац па аграрнай гісторыі Беларусі вылучанага ў дысертацыйным даследаванні перыяду. У манаграфіях, абагульняльных даследаваннях, артыкулах у зборніках і часопісах, энцыклапедычных выданнях, доктарскіх і кандыдацкіх дысертацыях з розных метадалагічных пазіцый раскрываюцца працэсы, якія адбываліся ў аграрным сектары Беларусі ў канцы XVIII ст. – 1850-я гг.

Без крытычнага і ўсебаковага асэнсавання назапашанага вопыту немагчыма ўсвядоміць спецыфіку сучаснага становішча гістарычнай навукі, рэалізацыі яе сацыяльнай, інтэлектуальнай і духоўнай функцый у грамадстве. Эфектыўнасць навуковай дзейнасці ў значнай ступені залежыць ад інтэнсіўнасці гістарыяграфічнага даследавання.

Працэс пераацэнкі гісторыі грамадства, які пачаўся з канца 1980-х гадоў, прывёў да складання ў гістарычнай навуцы розных поглядаў на разглядаемыя ў дысертацыі праблемы, што па сутнасці азначала пачатак фарміравання гістарыяграфіі, якая аб'ядноўвае даследчыкаў з рознымі, нярэдка прама процілеглымі, падыходамі да вывучэння тых. ці іншых пытанняў.

Вывучэнне гістарыяграфіі аграрнага развіцця Беларусі ў канцы XVIII ст. – 1850-я гг. ўяўляе асаблівую даследчую цікавасць ва ўмовах таго, што адбылося вылучэнне, афармленне і развіцце ўласнай беларускай гістарыяграфіі, пераацэнкі і выпрацоўкі новых крытэраў інтэрпрэтацый азначанай праблемы, пераасэнсавання цэлага шэрагу метадалагічных, крыніцазнаўчых, канкрэтна-гістарычных і тэрміналагічных аспектаў тэмы.

Тэматыка даследавання адпавядае Пераліку прыярытэтных накірункаў навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2011–2015 гг., зацверджанаму пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 19 красавіка 2010 г., і прыярытэтным накірункам навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2016–2020 гг., зацверджанаму пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 12 сакавіка 2015 г.

**Ступень навізны вынікаў, атрыманых у дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону.**

У дысертацыі ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі прысутнічае імкненне аўтара да крытычнага аналізу ўсяго таго, што зроблена ў Беларусі і ў Расіі ў вывучэнні дадзенай праблемы. Прапанавана перыядызацыя гістарыяграфіі аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850- х гг. Аўтарам выяўлены канцэптуальныя падыходы, тэндэнцыі і асаблівасці ў вывучэнні аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг., уласцівыя гістарыяграфіі Расійскай імперыі і савецкага перыяду, навуковым публікацыям у Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі. У першую чаргу ўвага засяроджана на параўнанні таго, што зроблена ў розныя гістарыяграфічныя перыяды, вызначаныя дысертантам. Дадзеныя параўнанні шмат у чым вызначаюць метадалагічнае аблічча праведзенай працы.

У канцэнтраваным выглядзе такія падыходы сфармуляваны ў навуковых палажэннях, якія вынесены на абарону. У прыватнасці, у палажэнні першым, вылучаючы тры асноўныя перыяды, саіскальнік адзначае, што характэрнай рысай гістарыяграфіі Расійскай імперыі (другая палова XIX ст. – 1917 г.) з'яўлялася выкарыстанне прынцыпаў прагматызму і гістарызму, уплыў «дзяржаўнай школы» і тэорыі «гандлевага капіталу» на змест даследаванняў, вядучай тэндэнцыяй гістарыяграфіі савецкага перыяду (1917–1991 гг. стаў уплыў класавага падыходу і метадалагічнага манізму на характар навуковых даследаванняў, што прывяло да перабольшвання тэмпаў генезісу капіталізму ў сельскай гаспадарцы, а таксама пераносу агульнарасійскіх ацэнак рзвіцця элементаў капіталізму на беларускі рэгіён, а для гістарычных даследаванняў ў Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі характэрна вывучэнне аграрнай гісторыі Беларусі, зыходзячы з сучасных метадалагічных падыходаў. Дадзеныя і іншыя навуковыя палажэнні сведчаць аб імкненні дысертанта да адпаведнай навізны ў сваім дысертацыйным даследаванні.

**Абгрунтаванасць і дакладнасць вывадаў і рэкамендацый, якія сфармуляваны ў дысертацыі.**

Гэта дасягаецца ў першую чаргу планам дысертацыйнага даследавання. Ён у неабходнай ступені адпрацаваны, лагічны і сарыентаваў аўтара на раскрыццё тэмы па яе асноўных навуковых напрамках.

Абгрунтаванасць і дакладнасць вывадаў і рэкамендацый дасягаецца таксама пэўнай крытычнасцю пры падыходах да ацэнкі тых ці іншых прац. Гэтую ж ролю выконвае і іх аналіз, які ў прынцыпе маецца ў дадзеным дысертацыйным даследаванні. Акрамя таго, важную ролю выконваюць тыя ацэнкі аналізуемай літаратуры, якія даюцца па ходу даследавання. Каб гэта рабіць, аўтару патрэбна ведаць шмат якія аспекты праблемы шырэй і глыбей, чым гэтым валодалі папярэднія даследчыкі. У цэлым можна канстатаваць, што дысертанту гэта ўдалося.

Дысертацыйнае даследаванне з'яўляецца самастойна выкананай працай. Саіскальнікам узнята важная навуковая праблема айчыннай гістарыяграфіі і прапанаваны падыход да яе вырашэння, які прадугледжвае аб'ектыўнае даследаванне існуючых уяўленняў на аснове гістарыяграфічнай рэфлексіі.

Метадалагічную аснову даследавання склала сукупнасць прынцыпаў (гістарызму, аб'ектыўнасці і каштоўнаснага падыходу), агульнанавуковыя (аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, узыходжанне ад канкрэтнага да абстрактанага) і канкрэтна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны) метады, што дазволіла вырашыць пастаўленыя задачы.

Асноўныя палажэнні дысертацыі атрымалі адлюстраванне ў дакладах аўтара на навуковых канферэнцыях: «Европа: актуальные проблемы этнокультуры» (Мінск, 22 красавіка 2013 г.), «Европа: актуальные проблемы этнокультуры» (Мінск, 21 студзеня 2014 г.), «Подзвігу народа жыць у вяках (да 70-годдзя Вялікай Перамогі)» (Мінск, 28 красавіка 2015 г.), «Социально-экономическая история Советской Беларуси (1917–1991 гг.)» (Минск, 26–27 октября 2023 г.).

**Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі.**

Прыведзеныя вышэй і іншыя асаблівасці дысертацыйнага даследавання даюць падставы сцвярджаць, што навуковая значнасць дысертацыі не выклікае сумненняў. Упершыню ў беларускай гістарычнай навуцы выяўлены канцэптуальныя падыходы, тэндэнцыі і асаблівасці ў вывучэнні аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг., уласцівыя гістарыяграфіі Расійскай імперыі і савецкага перыяду, навуковым публікацыям у Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі, што дазволіла сфармуляваць

канцэпцыю даследавання, выявіць праблемы, якія патрабуюць далейшай навуковай распрацоўкі.

Такое ж заключэнне адносіцца і да яе сацыяльна-эканамічнага і практычнага значэнняў. Высновы і асноўныя палажэнні дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры напісанні абагульняючых прац, метадычных дапаможнікаў і падручнікаў, пры распрацоўцы агульных і спецыяльных курсаў па гістарыяграфіі гісторыі Беларусі, а таксама эканамічнай гісторыі Беларусі. Атрыманыя аўтарам вынікі даследавання маюць значны практычны патэнцыял і могуць быць запатрабаваны органамі дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі адлюстраваны ў 6 навуковых артыкулах у выданнях, якія ўключаны ВАК Рэспублікі Беларусь у пералік навуковых выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (2,3 аўт. л.), 7 публікацый – у навуковых зборніках (1,5 аўт. л.), 3 – у зборніках матэрыялаў канферэнцый (0,6 аўт. л.)

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК.**

Дысертацыя і аўтарэферат Н.К. Сямашка аформлены ў адпаведнасці з патрабаваннямі Інструкцыі па афармленні дысертацыі і аўтарэферата ВАК Рэспублікі Беларусь, зацверджанай пастановай ВАК Рэспублікі Беларусь ад 22 жніўня 2022 г. № 5. Працу адрозніваe лагічнасць і паслядоўнасць выкладання матэрыялу, правільны і ясны стыль, акуратнасць у афармленні.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі суіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.**

Аналіз зместу дысертацыі, метадаў, якія выкарыстоўваюцца аўтарам даследавання і інтэрпрэтацыі атрыманых вынікаў дазваляе зрабіць заключэнне аб тым, што прадстаўленая да абароны праца Сямашка Надзеі Канстанцінаўны “Беларускія і расійскія даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)”, з’яўляецца навуковым даследаваннем па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання, адпавядае патрабаванням, якія прад’яўляюцца да кандыдацкіх дысертацый, а яе аўтар адпавядае патрабаванням, якія прад’яўляюцца да кандыдатаў навук.

У цэлым станоўча ацэньваючы навуковыя вынікі дысертацыйнага даследавання, разам з тым неабходна выказаць наступныя заўвагі:

– ступень завершанасці даследавання магла быць вышэй, калі б аўтар пры аналізе гістарыяграфічных даследаванняў аграрнай гісторыі Беларусі

(канец XVIII ст. – 1850-я гг.) звярнуў увагу не толькі на працы айчынных, але і расійскіх даследчыкаў;

– у сувязі з тым, што праца носіць гістарыяграфічны і крыніцазнаўчы характар, у першай главе “Гістарыяграфічныя даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.). Метадалогія і канцэпцыя даследавання” мэтазгодна было б падраздзел “Метадалогія і канцэпцыя даследавання” падаць у наступнай рэдакцыі “Крыніцы, метадалогія і канцэпцыя даследавання” і даць агульную характарыстыку крыніцавай базы даследавання. Тым больш, што ў самой працы для аналізу выкарыстаны разнастайныя гістарыяграфічныя крыніцы;

– аўтару не ўдалося пазбегнуць адпаведнага налёту публіцыстычнасці. У гэтай сувязі ў некаторых выпадках пры характарыстыцы крыніц і прац гісторыкаў па праблеме пераважае анатацыйна-ацэначны, а не аналітычны (акцэнтуючы ўвагу на якасці аргументацыі, а не толькі змястоўны пераказ асноўных тэзісаў аўтараў) падыход.

Аднак выказаныя заўвагі маюць форму пажаданняў, могуць з’яўляцца прадметам дыскусій, істотна не ўплываюць на агульную станоўчую адзнаку дысертацыйнага даследавання Н.К. Сямашка.

**Заключэнне.** Дысертацыя Сямашка Надзеі Канстанцінаўны “Беларускія і расійскія даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)”, з’яўляецца завершаным самастойна выкананым даследаваннем, якое ўносіць уклад у гістарыяграфічнае і крыніцазнаўчае вывучэнне аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.). У ходзе вывучэння дадзенай праблематыкі дысертант прадэманстраваў дастаткова высокі ўзровень ведаў па айчыннай і расійскай гістарыяграфіі, прадэманстраваў валоданне разнастайнымі метадамі навуковага даследавання, навыкамі працы з рознымі крыніцамі. Даследаванне адпавядае патрабаванням ВАК, якія прад’яўляюцца да дысертацый на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук, змяшчае новыя вынікі, сукупнасць якіх з’яўляецца пэўным дасягненнем у гістарычнай навуцы. Ёсць усе падставы сцвярджаць аб тым, што навуковая кваліфікацыя саіскальніка адпавядае навуковай ступені кандыдата гістарычных навук, якая можа быць прысуджана яму па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання **за**:

– аналіз прац навукоўцаў Расійскай імперыі, прысвечаных аграрнай гісторыі Беларусі, характэрнай рысай якіх быў пераважна апісальны метад, высновы ў большасці рабіліся без апоры на крыніцы. Пры гэтым даследаванні насілі пераважна этнаграфічны характар. Разам з тым, з’явіліся

публікацыі, якія паклалі пачатак заснаванню беларускай нацыянальна-гістарычнай ідэі;

– вызначэнне асноўных напрамкаў і прыярытэтаў ў даследаваннях савецкага часу на кожным з вылучаных саіскальнікам этапах. У параўнанні з папаярэднім перыядам працы савецкага перыяду вызначаліся шматаспектнасцю, больш глыбокім фактал агічным матэрыялам і ўвядзеннем у навуковы ўжытак новых архіўных крыніц. У гістарычнай навуцы Беларусі і Расіі пануючай з'яўлялася марксісцка-ленінская метадалогія;

– абгрунтаваную выснову аб тым, што аграрная і сацыяльна-эканамічная гісторыя беларускіх зямель канца XVIII ст. – 1850-х гг. амаль што не даследуецца сучаснымі расійскімі навукоўцамі.

– раскрыццё асаблівасцей метадалагічных падыходаў, уласцівых навуковым працам гісторыкаў Рэспублікі Беларусь ў працэсе даследавання аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст ст. – 1850-х гг. У адрозненне ад савецкіх гісторыкаў, для якіх першаступеннае значэнне мела вывучэнне гісторыі ніжэйшых слаёў грамадства, на сучасным этапе развіцця гістарычнай навукі пачынаюць даследавацца і іншыя саслоўныя групы насельніцтва. Для прац характэрны адыход ад партыйнасці і класавых пазіцый, вывучэнне аграрнай гісторыі Беларусі, зыходзячы з сучасных метадалагічных падыходаў.

Афіцыйны апанент:
доктар гістарычных навук, прафесар,
прафесар кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі
ўстановы адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны
ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна" У.В. Здановіч

03.12.2024 г.

Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна
АДДЗЕЛ КАДРАЎ
Подпіс Здановіча У.В. пацвярджаю